# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
1 красавіка
1993 года
№ 5 (1692)


ХТО КАГО?

## У АПАЛЕ Ў ПРЭМ'ЕРА

**На мінулым тыдні служба навін беларускага тэлебачання паведаміла: прэм'ер-міністр В. Ф. Кебіч збіраецца адмяніць ільготы на праезд для студэнтаў, але за кошт гэтага павялічыць стыпендыі. За каментарыем да гэтай інфармацыі мы звярнуліся ў Міністэрства народнай адукацыі. Як давялося высветліць, такая прапанова, сапраўды, паступала, але не была падтрымана. Міністэрствам быў распрацаваны праект аб немэтазгоднасці такога рашэння. І, як запэўніў нас намеснік міністра вышэйшай адукацыі Васіль Іванавіч Стражаў, інфармацыя аб адмене ільготаў для студэнтаў не мае пад сабой ніякіх канкрэтных дакументаў.**

**Але, як наконт другой часткі прапановы?...**

**Вольга УЛЕВІЧ.**

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

## ДЗЕВЯНОСТА ДРУГІ ПРАТРЫМАЛІСЯ. ЯК ЧАРГОВЫ ГОД ПРАСТАЯЦЬ?

***29 сакавіка адбыўся чарговы Вучоны савет універсітэта, на якім былі падведзены вынікі навукова-даследчай работы універсітэта і адбылося выбранне па конкурсе.***

Адзначыўшы дасягненні навукова-даследчых інстытутаў і факультэтаў універсітэта, дакладчык — прарэктар па навуцы **Анатоль Іванавіч ЛЕСНІКОВІЧ** зрабіў спробу ацаніць інтэлектуальны патэнцыял універсітэта па самым уразлівым паказчыку — колькасным. Аказваецца, агульная колькасць уласна навуковых супрацоўнікаў знізілася ў параўнанні з 1987 годам на 9 працэнтаў. Але побач з адпаведным паказчыкам па Беларускай акадэміі навук — 24 працэнты, пагрозу страты навукоўцаў ва ўніверсітэце можна лічыць амаль неадчувальнай.

У 1992 годзе абаронена 23 доктарскія і 52 кандыдацкія дысертацыі. Аб'ём фінансавання на навуку складае сёння 357,8 мільёнаў рублёў. Але васьмікратнае павелічэнне гэтай лічбы ніколькі не кампенсуе інфляцыю (да прыкладу: аптовыя цэны ў прамысловасці ўзраслі за гэты час у 26 разоў, рэальная заработная плата знізілася ў два разы).

На заканчэнне А. І. Лесніковіч зазначыў: «Нестабільнасць эканамічнай сітуацыі на Беларусі ў 1992 годзе не прывяла да драматычных вынікаў для навукі. Застаецца спадзявацца, што год наступны не будзе горшым».

Прысутнасць на пасяджэнні Вучонага савета намесніка міністра народнай адукацыі **Васіля Іванавіча СТРАЖАВА** і **начальніка ўпраўлення навукі Міністэрства народнай адукацыі Сяргея Сяргеевіча ВЯТОХІНА** дае падставы сцвярджаць, што Міністэрству, ва ўсялякім выпадку, лёс універсітэцкай навукі неабыякавы.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

### АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

*на замяшчэнне пасад:*

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** лікавых метадаў і праграміравання;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** дыферэнцыяльных ураўненняў; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; тэарэтычнага і славянскага моваЗнаўства;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** філасофіі і метадалогіі навукі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; тэарэтычнай фізікі; ядзернай фізікі; лазернай фізікі і спектраскапіі; фізікі цвёрдага цела; метадаў аптымальнага кіравання; матэматычнага забеспячэння САПР; вылічальнай матэматыкі; геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі (0,5 стаўкі); ураўненняў матэматычнай фізікі; неарганічнай хіміі; фізічнай хіміі; аналітычнай хіміі; беларускай літаратуры; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; крымінальнага права; грамадзянскага права;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; фізвыхавання і спорту; методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** раманскіх і класічных моў (французская і лацінская мовы); методыкі выкладання рускай мовы і літаратуры; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; канстытуцыйнага права;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** фізіялогіі раслін; матэматычнага забеспячэння САПР.

Тэрмін конкурсу — АДЗІН МЕСЯЦ з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

ДА НАС ПА СПРАВАХ

## НА БРУДЭРШАФТ З ДАНЧЫКАМ




***Богдан Андрусішын-Данчык праз чатыры гады зноў у Мінску. Але ў гэты раз ён прыехаў на Беларусь не як спявак, а як журналіст радыёстанцыі «Свабода» з нагоды 75 гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі.***

Прыехаў без гітары, якую ўжо год не трымаў у руках, і без маці Юлі, але з цёткамі Вольгай і Маргарытай. І вось 24 сакавіка адбылася сустрэча. Нягледзячы на незвычайна высокую плату за ўваход у Дом літаратара, зала была амаль перапоўненая. У холе прадаваліся кружэлкі спевака Данчыка (кожная 500 рублёў), кнігі, плакаты. У гэты вечар спявалі маладыя беларускія барды, як не аднойчы было падкрэслена, народжаныя Данчыкам. З залы паступалі цыдулкі з прызнаннямі, словамі ўдзячнасці і захаплення, з пытаннямі.


*(Працяг на 2-й стар.).*


## І НА БЕЛАРУСІ СВЯТА!

***Дзень утварэння 25 сакавіка 1918 года Беларускай Народнай Рэспублікі ніколі не святкаваўся ў Савецкай Беларусі. Былі зачынены архівы, у падручніках гісторыі — хлусня, сведкі — за мяжой. Таму так і атрымалася, што «неафіцыйнае» дзяржаўнае свята сёлета святкавалі амаль на дзяржаўным узроўні. Візіты нашых знакамітых землякоў з Амерыкі, найперш Старшыні Рады БНР Язэпа Сажыча і спевака Данчыка, толькі падкрэслілі важнасць гэтай даты. У шэрагу мерапрыемстваў свята прынялі ўдзел Старшыня Вярхоўнага Савета РБ Станіслаў Шушкевіч, пісьменнікі, паэты, дэпутаты, тыя, хто пачувае сябе сапраўднымі беларусамі. Тры чвэрці стагоддзя гэтага дня як бы не існавала, але народная памяць захавала яго, захавала імёны тых дзеячоў, чыімі рукамі ў далёкім 1918 годзе быў закладзены падмурак нашай сённяшняй дзяржаўнасці.***



ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

## ЗНОЎ ПАЕДЗЕМ У СТАЎРАПОЛЛЕ

***У службе занятасці моладзі і студэнтаў Беларусі пачалося фарміраванне летніх студэнцкіх атрадаў.***

На сёння заключана ўжо некалькі дагавораў з гаспадарнікамі на работу беларускіх студэнцкіх атрадаў. Стаўрапольскі край гатовы прыняць для збору садавіны і гародніны 600 чалавек. Шэсць гаспадарак Прыднястроўя чакаюць на дапамогу 1100 чалавек. Акрамя таго, рыхтуецца зводны студэнцкі атрад праваднікоў — 400 чалавек.

Фарміруюцца таксама атрады студэнтаў на розныя работы ў Рэспубліку Польшча і Чэхію. Гэта, як правіла, пасадка і ачыстка леса. Работа цяжкая, але высокааплачваемая.

НАШ БОЛЬ

## НЕ ЗАГУБІЦЕ ТАЛЕНТЫ!

***Прадстаўнікі навуковай грамадскасці і выкладчыкі Беларусі, сярод якіх доктар фізіка-матэматычных навук прафесар В. Бернік, кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт БДУ У. Котаў, кандыдат хімічных навук дацэнт БДУ В. Хвалюк і кандыдат біялагічных навук дацэнт А. Шалапёнак, звярнуліся з адкрытым лістом да Вярхоўнага Савета і ўрада Беларусі.***

У ім выказваецца занепакоенасць станам работы з таленавітымі дзецьмі. На думку вучоных, менавіта яны будуць вызначаць будучыню нашай навукі, тэхнікі і культуры. Але з-за адсутнасці валютных сродкаў каманды Беларусі па хіміі і фізіцы не прымалі ўдзел у сусветных алімпіядах у 1992 годзе. А сёлета вырашаць гэтыя пытанні стала яшчэ больш складана. Больш таго, пад пагрозай зрыву наогул удзел беларускіх дзяцей у сусветных алімпіядах і конкурсах.

У адкрытым лісце адзначаецца, што работа з таленавітымі дзецьмі вядзецца, але яна не скаардынавана. Тыя ж настаўнікі і вучні, якія займаюцца паглыбленым вывучэннем дысцыплін, сёння асабліва востра адчуваюць недахоп метадычнай літаратуры.

Таму, лічаць аўтары ліста, трэба неадкладна распрацаваць і прыняць навукова абгрунтаваную ўрадавую праграму па рабоце з таленавітымі дзецьмі, вызначыць гэту работу як адзін з прыярытэтных накірункаў унутранай палітыкі Беларусі. Ёсць таксама і патрэба ў стварэнні Рэспубліканскага цэнтра па рабоце з таленавітымі дзецьмі і спецыяльнага фонду для фінансавання гэтай работы.

СУСТРЭЧЫ

## З БОГАМ ПА СВЕЦЕ

**24 сакавіка студэнты факультэта журналістыкі мелі магчымасць замест звычайнай лекцыі па «замежцы» пачуць думкі доктара англійскай літаратуры Пітэра ЛОУНА аб вобразе Бога ў англійскім рамане.**

Пітэр Лоун па свайму веравызнанню належыць да канфесіі хрысціян-эапцістаў, дзесяць год ён вывучаў літаратуру ва Уэльскім універсітэце. Вынікам стала навуковая дысертацыя «Страчаны Бог у сучасным англійскім рамане». Пасля заканчэння вучобы Пітэр стаў дабрачынным лектарам, які ад міжнароднай арганізацыі «Саюз студэнтаў-хрысціян» ездзіць з лекцыямі аб літаратуры па Еўропе і краінах былога Саюза.

Галоўная ідэя лекцыі на журфаке: хрысціянскія вобразы і тэма хрысціянства ўвогуле ў раманах старой добрай Англіі зараз сышлі ў нябыт.

ЖАРТАЧКІ!

## УСЕ МЫ КАЛІСЬЦІ БЫЛІ СТУДЭНТАМІ

**На носе 1 красавіка. А мы не жартуем. Сур'ёзныя сталі, а, можа, старыя... Нават анекдотаў ніякіх успомніць не атрымліваецца. Але не, здаецца, адзін усё ж такі ёсць.**

Сесія. Ідзе чарговы экзамен. У аўдыторыю, дзе чакаюць студэнты, заходзіць выкладчык.

— Першае пытанне на 5 балаў: які прадмет здаём?

Цішыня.

— Так. Другое пытанне на чацьвёрку: як мяне завуць?

Цішыня.

— Трэцяе пытанне. На тройку. Якога колеру падручнік?

З задніх радоў чуецца прыглушаны шэпт: во звер! во завальвае!

Дарэчы. А ці не аб'явіць нам конкурс на лепшы студэнцкі анекдот? Усе мы калісьці былі студэнтамі. Таму удзельнічаць у конкурсе змогуць і выкладчыкі, і тыя, да каго наша газета трапіла, наогул, выпадкова. Успомнім былыя (а хто і не былыя) гады і пажартуем разам.

На працягу двух месяцаў дасылайце свае лісты на адрас: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9. Заходзьце ў 74, 75 кабінеты. Званіце па тэлефоне 20-68-27. Пажадана, каб акрамя анекдотаў, вашы лісты змяшчалі ў сабе прапановы наконт прыза. У памерах разумнага, канешне. Разумнае — гэта прыкладна рублёў 500). Вынікі конкурсу будуць падведзены ў канцы мая. Прычым самастойны конкурс будзе весціся і сярод прапаноў наконт прыза.

ДА ВАШАГА ВЕДАМА

# НОВАЕ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

***Палітычная навука (гэта паняцце ўжываецца аўтарам аналагічна з паняццем «паліталогія») у яе акадэмічным сэнсе робіць сёння першыя крокі. Першая кафедра паліталогіі была створана ў лютым 1990 года ў нашым універсітэце. Да таго часу тыя ці іншыя аспекты палітычных праблем вывучаліся ў межах самых розных гуманітарных і грамадскіх навук. У верасні 1992 года на філасофска-эканамічным факультэце было адкрыта аддзяленне паліталогіі. І цяпер кафедра забяспечвае чытанне лекцый па двух курсах. Першы з іх «Паліталогія» чытаюць практычна ўсе выкладчыкі кафедры, ён фарміруе асновы сістэмнага ўяўлення аб галоўнай праблематыцы паліталогіі. Другі — «Палітычная сацыялогія» прапануецца па выбару студэнтам гуманітарных факультэтаў.***

У сувязі з пераходам універсітэта на шматузроўневую сістэму адукацыі кафедрай паліталогіі распрацаваны праграмы падрыхтоўкі бакалаўра і магістра палітычных навук. Патрабаванні да тэрмінаў навучання для атрымання ступені бакалаўра — 4 гады, ступені магістра — 2 гады для асоб, якія маюць ступень бакалаўра. Праграма падрыхтоўкі бакалаўра прадугледжвае паслядоўнасць курсаў, арганізаваных па акадэмічных семестрах. 80 працэнтаў вучэбнага часу адводзіцца на вывучэнне палітычных навук, 20 працэнтаў — курсам з ліку так званых ліберальных ведаў, якія могуць быць праслуханы на іншых факультэтах і аддзяленнях універсітэта. Кафедра плануе выкладанне па чатырох асноўных раздзелах палітычнай навукі:

1. ПАЛІТЫЧНАЯ ТЭОРЫЯ. У межах гэтага раздзелу студэнтам будуць прапанаваны наступныя курсы: гісторыя сусветнай палітычнай думкі, уводзіны ў палітычную тэорыю, палітычныя ідэалогіі, палітычная этыка, мадэлі дэмакратыі, гісторыя палітычнай думкі Беларусі, тэорыя канфлікту, тэорыя дэмакратыі, палітыка і рэлігія, палітычная філасофія, тэорыя міжнародных зносін.

2. ПАРАЎНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА. Прапануюцца курсы: найноўшая палітычная гісторыя краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, палітычная гісторыя Беларусі, сацыяльная стратыфікацыя і групы інтарэсаў у палітыцы, палітычныя партыі і рухі, выбарчыя сістэмы, парламентарызм, палітычная культура і ўдзел, палітычныя эліты, палітычныя сістэмы Германіі, Францыі, ЗША, Польшчы.

3. ГРАМАДСКАЕ КІРАВАННЕ І АДМІНІСТРАЦЫЯ. Гэты раздзел уключае такія курсы, як: уводзіны ў грамадскае кіраванне, асновы тэорыі права, канстытуцыйнае права, адміністрацыйнае права, працоўнае права, асновы грамадзянскага і гаспадарчага права, уводзіны ў грамадскую адміністрацыю, эканамічная палітыка, фінансавая палітыка, сацыяльная палітыка, палітыка ў галіне адукацыі і культуры, правы чалавека, этнапалітыка, палітыка ў галіне нацыянальнай бяспекі, арганізацыя выбарчых кампаній.

4. РАЗДЗЕЛ МЕТАДАЛОГІЯ І МЕТАДЫ ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУКІ ўключае такія курсы, як: інфарматыка, метадалогія палітычнай навукі; палітычная сацыялогія, метады палітычнай навукі; работа з ЭВМ; палітычнае прагназіраванне; інтэрв'ю, метады. інфармацыйнае забеспячэнне Вярхоўнага Савета і ўрада Беларусі, грамадская думка, даследчыцкія цэнтры Беларусі.

Праграма прафесійнай падрыхтоўкі прадугледжвае абавязковы выбар студэнтамі аднаго з варыянтаў спецыялізацыі:

1. Палітычныя працэсы і інстытуты: тэорыя і метадалогія аналізу. Гэты профіль для тых, хто плануе працаваць у акадэмічных інстытутах, выкладаць палітычныя дысцыпліны ў вышэйшых навучальных установах, сярэдніх і сярэднеспецыяльных школах.

2. Тэорыя і практыка дзяржаўнага і палітычнага кіравання. Гэты профіль для тых, хто будзе зацікаўлены ў палітычнай дзейнасці і кіраванні, уключаючы мясцовыя органы ўлады, палітычныя арганізацыі і рухі, прафсаюзы, прыватныя арганізацыі. Спецыялісты дадзенага профілю змогуць працаваць у аналітычных службах сродкаў масавай інфармацыі, дзяржаўных установах і спецыяльных арганізацыях.

Для атрымання ступені бакалаўра студэнты павінны: атрымаць фіксаваную колькасць крэдытаў па абавязковых навуках; на працягу чатырох гадоў напрацаваць фіксаваную колькасць крэдытаў па адпаведных універсітэцкіх курсах у галіне ліберальных ведаў; здаць экзамен на ступень бакалаўра; здаць зводны экзамен у абранай сферы палітычнай навукі; падрыхтаваць і абараніць дыпломную работу на ступень бакалаўра. Праграма падрыхтоўкі магістра разлічана на атрыманне ступені магістра для спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і тых, хто валодае ступенню бакалаўра не па палітычных навуках. Навучанне разлічана на два гады.

На кафедры створана аснова праграмна-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэса. Кафедра наладзіла трывалыя кантакты і вядзе абмен інфармацыяй з навуковымі цэнтрамі ў Беларусі і за мяжой. З Каліфарнійскім універсітэтам падпісаны дагавор аб навуковым супрацоўніцтве, з Фонда міжнароднага кнігаабмену (што ў Нью-Йорку) нам дасылаюць навуковую і вучэбную літаратуру. Дарэчы, у кафедральнай бібліятэцы налічваецца каля 150 тамоў замежнай літаратуры. Кафедра цесна супрацоўнічае з кафедрай палітычнай навукі Латвійскага дзяржаўнага універсітэта, пададзена заяўка на ўсталяванне навуковых кантактаў з Педагагічным універсітэтам г. Кельце (Польшча) і Інстытутам палітычных навук Варшаўскага універсітэта.

Курсы і праграмы, якія прапануюцца кафедрай паліталогіі, прызначаны дапамагчы студэнтам стаць больш актыўнымі ўдзельнікамі пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы. Паліталогія дае ўяўленне аб тым, як «будуецца» палітыка і якім чынам грамадзяне могуць уздзейнічаць на гэтую палітыку. Нашы праграмы разлічаны на падрыхтоўку вучоных-палітолагаў, палітычных дзеячоў і адміністратараў палітыкі ў самых розных сферах. Студэнты могуць выбарча займацца такімі раздзеламі навукі як «Тэорыя і метадалогія палітычнай навукі» альбо «Параўнальны аналіз форм кіравання». Курс «Грамадскае кіраванне і адміністрацыя» разлічаны на тое, каб падрыхтаваць студэнтаў да займання адміністратыўных пастоў у службах і ведамствах грамадскага сервісу, у органах мясцовага самакіравання. Студэнты атрымаюць неабходныя веды і ў галіне «паблік рэлейшын», каб авалодаць тэхнікай палітычнага менеджмента, неабходнай для правядзення грамадскай палітыкі.

Якія ж магчымасці кар'еры для спецыяліста са ступенню бакалаўра ці магістра палітычных навук? Зразумела, на Беларусі не было і не магло быць вопыта падрыхтоўкі і выкарыстоўвання спецыялістаў у гэтай галіне. У большасці заходніх краін выпускнікі аддзяленняў паліталогіі карыстаюцца попытам ва ўсіх сферах, улічваючы бізнес. Яны працуюць ва ўрадавых службах, агенцтвах і офісах, у кампаніях і арганізацыях. Шырокае распаўсюджанне мае практыка паралельнага навучання і атрымання другой спецыяльнасці. Таму палітолагі працуюць журналістамі, займаюць самыя розныя адміністратыўныя пасады ў апаратах заканадаўчых і выканаўчых органаў улады на цэнтральным і мясцовым узроўні. Яны працуюць журналістамі, рэпарцёрамі, юрыстамі, спецыялістамі ў галіне міжнароднай палітыкі. У заходніх краінах аналітычныя бюро і аддзелы існуюць у кожнай сур'ёзнай арганізацыі, не гаворачы пра міністэрствы і ведамствы.

У хуткім часе дзяржаўныя службы і прыватныя фірмы, палітычныя партыі і рухі не змогуць абыйсціся без палітолагаў-аналітыкаў, без спецыялістаў па сувязях з грамадскасцю, арганізацыі выбарчых кампаній.

Кафедра будзе накіроўваць сваіх студэнтаў на практыку ў навукова-даследчыя інстытуты і арганізацыі, у органы мясцовага самакіравання, у палітычныя партыі і рухі. Лепшым з іх будзе прадастаўлена магчымасць праходзіць практыку ў штаце пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Беларусі, вышэйшых органаў выканаўчай улады. Мы разлічваем даць нашым студэнтам сур'ёзную юрыдычную падрыхтоўку з тым, каб іх адукацыя адпавядала наменклатуры адміністратыўных пасад, якія патрабуюць юрыдычнай адукацыі.

Наша праграма падрыхтоўкі спецыялістаў-палітолагаў разлічана не толькі на студэнтаў аддзялення паліталогіі. Ступень магістра палітычных навук змогуць атрымаць выпускнікі любога факультэта універсітэта, тыя, хто валодае дыпломам і ступенню бакалаўра. Дарэчы, кафедра імкнецца даць максімум спецыяльных ведаў усім тым, хто не выключае для сябе магчымасці кар'еры палітычнага вучонага, грамадскага дзеяча, палітычнага адміністратара.

**С. РАШЭТНІКАЎ,**
**в. а. загадчыка кафедры паліталогіі.**

ДА НАС ПА СПРАВАХ

# НА БРУДЭРШАФТ З ДАНЧЫКАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Данчык, вы прыехалі на Беларусь як журналіст, аб чым вы хочаце расказаць па вяртанні ў Мюнхен?**

— Так атрымалася, што я прыехаў да вас адразу ў двух якасцях: як спявак Данчык і як журналіст Максім Лукашэвіч. Гэта вельмі цяжка быць двума людзьмі адначасова. Бо пакуль у мяне няма магчымасці працаваць з мікрафонам. Тым больш што перамагае Данчык... Але я буду на ўсіх святах, прысвечаных 75 угодкам абвяшчэння незалежнасці Беларусі, буду ў Вільнюсе на адкрыцці помніка Луцкевічам. Пакуль не скончацца святы, я застануся ў Мінску, бо аб усім гэтым збіраюся расказаць у Мюнхене.

**— Журналістыка для вас — гэта сур'ёзны занятак, ці проста Данчык любіць мяняць свае хобі і прыхільнасці?**

— Я заўсёды хацеў мець кар'еру спевака, але гэта ніколі не было для мяне працай. А трэба ж неяк жыць і мець грошы на жыццё. Давялося жыць у Еўропе і працаваць там на радыё. Дарэчы, я па адукацыі журналіст.

**— Дзе лепей жывецца ў Мюнхене ці ў Штатах?**

— Калі я пераехаў з Амерыкі — краіны ультракапіталістычнай, у Еўропу, дзе ўсе краіны маюць усё ж такі сацыялістычны ўхіл, то адчуў вялікія змены. Мне давялося перажыць настальгію па сваёй радзіме, па той зямлі за Нью-Йоркам, дзе я нарадзіўся. Гэта было ўпершыню... І мне здаецца, што ў Амерыцы лепей.

**— Ці не стамляе вас роля агульнага пястуна?**

— Вы ведаеце, за гэтыя гады я зразумеў, што для мяне гэта другая кар'ера — быць зоркай. Бо прыходзіць вельмі многа лістоў, тэлефонных званкоў... Шмат часу трэба, каб адказаць на ўсю гэтую ўвагу. Але мне вельмі прыемна, што праз мяне ідзе адраджэнне Беларусі, што людзі збіраюцца вось на такія вечарыны і спяваюць свае песні.

***Але менавіта з гэтага моманту роля агульнага пястуна, сапраўды, стала стамляць... У залу няцвёрдым поступам з пакункам піражкоў увайшоў вядомы беларускі паэт Анатоль Сыс. Прайшоўшы праз сцэну і запэўніўшы чарговых выканаўцаў у тым, што яны яму не перашкаджаюць, неяк так падзіўнаму, па-панібрацку спрабаваў пацісну руку замежнаму госцю. У паветры запахла смажаным. Магчыма, піражкамі.***

***Я не адвяргаю той думкі, што калісьці, можа, яшчэ чатыры гады назад, Анатоль Сыс піў разам са спеваком Данчыкам. Але навошта ў такі цудоўны вечар пры людзях (астатнім таксама ж хочацца) даставаць амаль выпітую літровую бутэльку гарэлкі? ...Адным словам, мюнхенскі журналіст, які даўно не бачыў нецвярозых беларускіх паэтаў, вымушаны быў збегчы са сцэны. Адразу ж пачуўся магнітафонны запіс песні «Адраджэнне», якую Данчык паспеў запісаць разам з «Сябрамі» і якая абяцалася яшчэ напачатку вечара. Народ устаў як пад час гімну і запляскаў у далоні, хтосьці кінуўся ўслед за Данчыкам за кулісы...***

***...У фае размаўлялі панашаму, па-простаму:***

***— Ну і што Данчык? Збег. А мог бы і выпіць.***

***І праўда, колькі там той гарэлкі засталося. Грамаў 200, не болей. Тым больш, што закуска нядрэнная.***

**Вольга УЛЕВІЧ.**

ВЫ ЧУЛІ?



***Калі вы маеце дзве з паловай сотні рублёў і вялікае жаданне бліжэй пазнаёміцца з Ельцыным ці Пятром І — кіруйце ў Дзяржаўны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.***

***Выставе васкавых фігур вы лёгка аддасце і гадзіну, і другую, асабліва калі вас вельмі цікавіць рост Гарбачова, выраз твару Леніна ці агульны знешні выгляд Сталіна. А яшчэ сям'я Мікалая II, Фёдар Дастаеўскі і Аляксандр Суворaў. Выстава прыехала да нас з Масквы, а зірнуць на такіх знакамітых гасцей заўсёды было цікава. Вельмі раім.***

**С. ВАСІЛЬЕЎ,**
фота аўтара.


## СП ЗАПРАШАЕ НА РАБОТУ

— ХІМІКА, пажадана спецыяліста ПА ТЭРПІНОІДАХ.

Можна звяртацца студэнтам апошняга курса ці аспірантам;
— **ЮРЫСТА.**

ТЭЛЕФОН ФІРМЫ 39-52-75.


СЛУЖБА 03

# ВЫПАДКОВЫЯ СУСТРЭЧЫ

На прыём да гінеколага ў студэнцкай паліклініцы ўсё часцей звяртаюцца дзяўчаты з нагоды непажаданай цяжарнасці. Яны пакуль не ведаюць, што нават дасягнуўшы вялікіх поспехаў у навуцы, на працы, жанчына не зможа лічыць сябе паўнацэнным чалавекам, калі не будзе мець дзяцей. Штучнае ж перарыванне цяжарнасці часта прыводзіць да таго, што легкадумная жанчына назаўсёды пазбаўляецца магчымасці стаць маці.

Адсутнасць культуры палавога жыцця, сексуальная непісьменнасць сталі небяспечным бар'ерам на шляху барацьбы са СНІДам. Разам з ядзернымі і экалагічнымі катастрофамі СНІД ставіць пад сумненне сам факт выжывання чалавецтва. Эпідэмія СНІДу набывае ўсё большы маштаб. Штомесячна ў свеце рэгіструецца каля 6 тысяч людзей, якія захварэлі.

СНІД — хвароба асаблівая. Яна пагражае існаванню чалавечага рода як біялагічнага віда. Калі не атрымаецца ў бліжэйшыя гады знайсці эфектыўныя сродкі і метады прафілактыкі, то перад намі паўстане пагроза вымірання.

Матэматычныя падлікі эпідэміі СНІДу на тэрыторыі былога СССР дазваляюць чакаць у 2000 годзе больш за 30 тысяч выпадкаў гэтага цяжкага захворвання і ад 1 да 1,5 мільёна тых, хто заразіўся.

Пад час адсутнасці вакцыны эпідэмію СНІДу можна стрымаць, толькі рэгламентуючы сексуальныя паводзіны чалавека. Але калі паспрабаваць спачатку вывучыць сацыяльныя і біялагічныя прычыны розных відаў сексуальнай распуснасці і пазбавіцца іх, а ўжо потым змагацца са СНІДам, дык выратоўваць, магчыма, ужо не будзе каго.

Хвароба, як вядома, не перадаецца пры звычайным бытавым кантакце. Таксама і праз харч, ваду, паветра. Аднак не варта карыстацца чужымі брытвамі для галення, манікюрнымі прыладамі, зубнымі шчоткамі, на якіх могуць захавацца элементы крыві.

Каб папярэдзіць захворванне на СНІД трэба пазбягаць выпадковых палавых сувязей, а таксама палавых кантактаў з гомасексуалістамі, наркаманамі і асобамі, якія вядуць хаатычнае палавое жыццё.

**Г. ГАЛЬЧАНЮК,**
**урач.**

# «НАМ ЯШЧЭ ТРЭБА РАБІЦЬ САБЕ ІМЯ...»



**ПРАВОДЗЯЧЫ НАШЫХ ВЯСЁЛЫХ І ЗНАХОДЛІВЫХ У МАСКВУ НА ГУЛЬНЮ З ПЕЦЯРБУРГАМ І АДЭСАЙ, ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛАСЯ ВЕРЫЦЬ У ЯЕ СТАНОЎЧЫ ЗЫХОД. НЕ АТРЫМАЛАСЯ. ПРАЙГРАЛІ. НЕПРЫЕМНА? ТАК. НЕЧАКАНА? ХУТЧЭЙ, НЕ. СЮРПРЫЗАМ (ПРЫЕМНЫМ, ЗРАЗУМЕЛА) БЫЛА Б ПЕРАМОГА УНІВЕРСІТЭЦКАЙ КАМАНДЫ, УПЕРШЫНЮ ТРАПІЎШАЙ НА ТАКІ ПРАДСТАЎНІЧЫ ТУРНІР.**

**МЫ ЯШЧЭ ПАБАЧЫМ САМУ ГУЛЬНЮ, ДАКЛАДНЕЙ, ЯЕ ТЭЛЕВАРЫЯНТ, ПА «АСТАНКІНА». АДНАК ПАЧУЦЬ НЕШТА АД САМІХ УДЗЕЛЬНІКАЎ, МНЕ ПАДАЕЦЦА, БУДЗЕ ЦІКАВЫМ. МОЙ СУБЯСЕДНІК — АЛЯКСЕЙ РУДЗЬКО, АДМІНІСТРАТАР КАМАНДЫ.**



**— Аляксей, гульня ўжо адышла ў гісторыю, таму скажы шчыра, на што вы разлічвалі і ці быў у вас шанс перамагчы больш знакамітых сапернікаў?**

— Надзея, безумоўна, была. Спадзяваліся зачапіцца за другое месца. Але, на жаль... Адэсіты перамаглі, таму што яны адэсіты: у іх ужо ёсць сваё імя, свой імідж. Што датычыцца Піцера, то каманда, на здзіўленне многіх, выступіла вельмі моцна. Напэўна, гэта быў пік іх формы. Гулялі яны лепш за адэсітаў, але ў выніку сталі другімі.

**— І на фоне іх вы выглядалі...**

— Не намнога слабейшымі. Не ўсё мы як след адрэпетыравалі, былі недапрацоўкі ў асобных нумарах. У першую чаргу гэта датычыцца хатняга задання, якое давялося перапрацоўваць ужо ў Маскве.

**— На якасць выступлення, напэўна, уплывалі і недахоп вопыту, і хваляванне?**

— Не, да гульні каманда падышла з цвярозым розумам і без страху перад сапернікам. «Візітку» адпрацавалі добра, ні ў чым не ўступалі адэсітам і піцерцам у экспромтах. Аднак у літаратурным конкурсе нас проста засудзілі, паставіўшы вельмі нізкі бал.

**— Ёсць сэнс звярнуцца да судзейства? Ужо не раз даводзілася чуць, што часам на гульнях журы паводзіць сябе, мякка кажучы, дзіўна.**

— Цяжка абвінавачваць членаў журы ў прадузятасці, несумленнай гульні. Проста нельга не ўлічваць, што і на суддзяў уздзейнічае не толькі гульня, але і імя каманды. Джэнтльмены ёсць джэнтльмены, і нічога тут не напішаш.

**— У Маскве каманда прабыла тыдзень. Як вам там жылося, чым вы займаліся ў вольны час?**

— Размясцілі нас добра. Жылі ў нумарах-люкс, мелі свой аўтобус. Здараліся праблемы з харчаваннем (вечарам пасля рэпетыцыі ўжо нічога не дастанеш), але выручалі нашы дзяўчаты. За што ім і нашаму спонсару АКФ «Нэссі» вялікі дзякуй. Ад нядзелі да аўторка мы рэпеціравалі, дапрацоўвалі праграму, а астатнія дні з намі працавала тэлебачанне. Нас уразілі адносіны да працы супрацоўнікаў «Астанкіна». Яны вывучалі кожны наш рух, запаміналі кожнае слова. Не дзіўна тады, што па тэлебачанні мы бачым не проста гульню вясёлых знаходлівых, але і цудоўнае шоў. Ёсць чаму павучыцца БТ, якое прыязджае на гульню рэспубліканскага КВЗ за дзве гадзіны да пачатку і запісвае яе як футбольны матч.

**— Аляксей, ёсць чуткі быццам многія каманды супрацоўнічаюць з прафесійнымі сатырыкамі. У прыватнасці, адэскім джэнтльменам дапамагае сам Міхаіл Жванецкі...**

— Не, гэта проста чуткі. Наш жанр, сапраўды, блізкі да іх жанру. Але ж сатырык піша свае тэксты для аднаго-двух выканаўцаў, а не для вялікай каманды КВЗ.

Калі казаць пра адэсітаў, дык у іх камандзе хапае сваіх аўтараў. Нават з лішкам, бо тэксты яны прадаюць яшчэ і хлопцам з Баку.

**— Першая гульня ў клубе Маслюкова стала для вас апошняй. Чым вы збіраецеся запоўніць рэштку сезона?**

— На рэспубліканскі турнір КВЗ нас ужо ніхто не пусціць, таму давядзецца выступаць у розных «капусніках». Дарэчы, ужо прыйшло запрашэнне на рэспубліканскі конкурс. Калі каманда пераадолее наследствы Масквы, то з радасцю прымем запрашэнне.

Плануем таксама паездку ў Херсон на адкрыты украінскі турнір КВЗ. Пакуль жа мы стаім перад фактам свайго пройгрыша.

**— І апошняе пытанне: у Маскву яшчэ хочацца?**

— Безумоўна. У наступным годзе мы збіраемся на агульны фестываль, куды, ужо як пастаянныя члены клуба, маем права прыехаць без папярэдняга адбору. Праўда, шанцаў на тое, што нас зноў выбяруць у вышэйшую лігу (так цяпер называецца рэгулярны сезон) няшмат.

**Гутарыў Аляксандр ЮРЫН.**





ДАРОСЛЫЯ ГУЛЬНІ

## ЧАМУ РЭЖЫСЁР АПЛАДЗІРУЕ ТОЛЬКІ Ў ДУМКАХ?

***Дата нараджэння гэтай гульні — 19 жніўня 1992 года. І калі адна з'ява, распачатая годам раней, але менавіта ў гэты дзень, скончылася вельмі хутка, то дзіця творчага маладзёжнага аб'яднання «Крок» пакуль што расце і развіваецца нармальна, бавячы сваіх бацькоў і тэлегледачоў ужо другім дзесяткам гульняў.***

Craраліся «Пяць зорак» як першая беларускамоўная гульня, з'арыентаваная перш за ўсё на вывучэнне беларускай гісторыі і культуры. Але не толькі. Многія гульні «Пяці зорак» былі прысвечаны іншым тэмам: 500-годдзю з дня адкрыцця Амерыкі, гісторыі і сучаснасці Польшчы, Расіі. Ёсць у беларускай гульні штосьці і ад «Поля цудаў», і ад марскога бою, і ад «Што? Дзе? Калі?», але нягледзячы на гэтае падабенства, «Пяць зорак» — самастойная гульня І, у адрозненні ад усіх расійскіх, не з'яўляецца аналагам замежнай.

— Мы з Мікалаем Кузняцовым наўмысна імкнуліся вынайсці веласіпед. Гульню мы прыдумалі яшчэ ў час працы на радыё. Дакладней, прыдумаў я, а Мікалай дадаў да яе адну рысу, якая зрабіла гульню больш цікавай.

Не звяртайце ўвагі на залішнюю сціпласць **Анатоля ВЕЧАРА. Скажу вам па сакрэту, менавіта яго ўсе лічаць «ідэолагам» «Пяці зорак».**

**— Анатоль, і як, на ваш погляд, гульня атрымалася?**

— На працэнтаў трыццаць.

**— А як жа астатнія 70?**

— Яны ад нас не залежаць. Трэба шмат чаго ведаць, каб зрабіць гульню, пачынаючы з тэхнічных ведаў і заканчваючы агульнымі. Мы яшчэ дылетанты ў гэтай справе. Нам патрэбны прафесіяналы. А, па-другое, наша тэлебачанне (я ўжо не кажу пра свет, а толькі пра краіны СНД) — самае жабрацкае. Напачатку мы атрымлівалі на гульню 2 тысячы, у той час калі яна каштавала недзе тысяч сто. Спонсары ёсць спонсары. Першапачатковы ж капітал нам прыходзілася выпрошваць убаку. Наогул, грошы — самы складаны момант у стварэнні гульні.

Так, цяпер мне зразумела, чаму стваральнікі «Пяці зорак» такімі небяспечнымі лічаць разумных удзельнікаў, якія забіраюць з сабой тэлевізары, тэлефоны, магнітафоны і, наогул, што трапляецца на вочы. Але, калі ўжо прыйдзецца, аддаюцца прызы з вялікім задавальненнем. А аднойчы нават жавальныя гумкі бясплатна раздаваліся.

Але ўсё ж такі мне дзіўна, як пры такім жабрацтве БТ (ды і не толькі яго) можна было адважыцца на стварэнне шоў-гульні? Зараз знойдзем самую буйную фігуру сярод рэжысёраў беларускага тэлебачання, у яе і запытаем. Знаёмцеся: **Сяргей ШЫНКАРЭНКА.**

— Магу адказаць вельмі проста. Калі б мы не імкнуліся нічога зрабіць, мы б да гэтага часу хадзілі б у шкурах і жылі ў пячорах. Заўсёды ў чалавеку сядзіць жаданне куды-небудзь тузануцца: а раптам штосьці атрымаецца... нават з таго, што ў яго ёсць...

— А я думаю, чаго яны тут, у «Кроку», усе такія тузаныя... Усё імкнуцца да нечага новага. Але...

У студыі гульня выглядае, як прывабнае шоў. Па тэлевізары гэта ўжо больш сумна, не так прыгожа...

— Галоўная прычына ў нашых тэхнічных магчымасцях. Мы не можам канкурыраваць ні з адной расійскай гульнёй: яны бяруць сваёй прыгожай тэлевізійнай абгорткай, удалай рэкламай. У іх ёсць магчымасць працаваць. Мы ж ствараем сваю гульню на тэхніцы 70-х гадоў. Аб чым тут можна гаварыць? Хоць у думках я і апладзірую, што нават пры такім становішчы мы адважваемся штосьці рабіць. Я ўжо амаль год выношваю ідэю камп'ютэрнай графікі.

**— Ну і як?**

— Робім першыя спробы афармлення гульні сумесна з фірмай «BEVALEX», але гэта зусім не той узровень, на якім хацелася б працаваць.

**— А хоць калі-небудзь узровень стане «тым»? Ці гледачам БТ, наогул, і марыць не трэба аб перадачах новай якасці?**

— Пакуль будзе гэта тэхніка, будзе такі ж узровень. Можа, трохі лепш, трохі горш. Але толькі трохі. Бо ва ўсім свеце тэлебачанне вырашана сёння на аснове камп'ютэрнай графікі. Напэўна і нашым кіраўніцтвам робіцца нейкія спробы, нешта купляецца. Але, у рэшце рэшт, што б ні куплялася, вынік — на экране.

Сапраўды. І вынік гэты вельмі сумны. Недастатковасць тэхнічных сродкаў, не кажучы ўжо пра іх састарэласць, бязлітасна абмяжоўвае творчы патэнцыял усіх, хто сёння спрабуе працаваць на беларускім тэлебачанні. І нават здымачная тэхніка і некалькі мантажных сталоў, закупленыя нядаўна тэлебачаннем на выдзеленыя дзяржавай сродкі, ніякім чынам не змянілі існуючага становішча.

Але я ведаю, хто нас нарэшце суцешыць — вядучы гульні **Алесь КРУГЛЯКОЎ.** Ён заўсёды так ветліва ўсміхаецца, жартуе, тэлевізары дорыць.

**— Алесь, ты азартны чалавек?**

— Безумоўна.

**— І не складана табе, азартнаму чалавеку, весці азартную гульню?**

— Складана ў тым плане, што ўсе тыя прызы, што стаяць у студыі хочацца займець самому, а даводзіцца аддаваць іншым людзям.

**— Нешта ты не ў тым плане азартны... нават небяспечна... У вашай гульні шанцуе ўдачлівым ці інтэлектуалам?**

— Наша гульня непрадказальная. Але, безумоўна, калі інтэлектуал будзе яшчэ і тым чалавекам, якому шанцуе ў выбары зорак, то... То ён проста выйграе тэлевізар, як зрабіў гэта наш удзельнік з Гомеля Леанід Клімовіч.

**— Да вас напэўна, прыходзіць вялікая колькасць лістоў? Што цікавага пішуць тэлегледачы?**

— О! Цікавага вельмі шмат. Калі спачатку нашы тэлегледачы вялі сябе вельмі сціпла, усе лісты былі амаль аднолькавымі: прывітанне, трохі аб сабе, я хачу ўдзельнічаць у вашай гульні. То зараз часам палохаешся, раскрыўшы чарговую паштоўку. Пасля таго, як прайшоў першы перапуд, мы вырашылі скласці маленькі хіт-парад такой пошты пад назвай «Панопцікум «Пяці зорак». Трэцяе месца ў гэтым хіт-парадзе займае ліст, змест якога прыкладна такі: дашліце мне спадніцу-рызінку, пажатую куртку, рызінку для валасоў, ляльку «Сіндзі» і г. д. Спіс працягваецца. Ліст, які атрымаў другое месца, змяшчае ў сабе не зусім, каб геніяльныя вершы і просьбу даслаць тэлефон на кнопках. Ну а першае месца — гэта, наогул, шэдэўр: зрабіце гульню «Пяць зорак» кожны дзень і перавядзіце, калі ласка, што такое «МАКАЁНКА»?

Вось такая гульня. Вось такія сур'ёзныя (месцамі не вельмі) людзі ў яе гуляюць. Яны бачаць усе яе хібы і хуткай славы не чакаюць. Бо лічаць, што «Пяці зоркам», як кожнай новай з'яве, складана адразу стаць даскаталай, і знайсці свайго гледача можна толькі з цягам часу. Але, на маю думку, з цягам часу можна і згубіць... Згубіць жаданне «гуляць» і ствараць.

**Вольга УЛЕВІЧ.**

КАРАБЕЙНІКІ

## УСЕ МАЙСТРЫ Ў ГОСЦІ ДА НАС

***10—11 красавіка ў музеі землязнаўства геаграфічнага факультэта адбудзецца першая на Беларусі выстава-кірмаш «Каменная казка». Заяўкі на ўдзел у выставе ўжо паступілі ад майстроў-ювеліраў і калекцыянераў з Масквы, Санкт-Пецярбургу, Украіны, Урала і іншых традыцыйных раёнаў апрацоўкі натуральных камянёў.***

*На кірмашы будуць прадстаўлены да продажу пацеркі, завушніцы, кулоны, падвескі, скарбонкі, сувеніры, калекцыі камянёў і асобныя мінералы. Цэны прызначаюць самі майстры, але з імі можна будзе дамовіцца.*

*Асноўная мэта выставы-кірмашу, як лічыць загадчыца музею* **Крысціна Мікалаеўна РАМАНЕНКА,** *даць людзям узоры сапраўднага, высокакультурнага ювелірнага мастацтва. Тым больш, што ў наведвальнікаў выставы будзе магчымасць атрымаць парады спецыялістаў, як выбіраць упрыгожванні з камня і вызначаць іх сапраўднасць.*

*Усяго два дні працуе выстава: у суботу і нядзелю. Але ёсць сэнс завітаць у родныя сцены ў выхадны.*

**Вольга УЛЕВІЧ.**

# СТУДЫЁН

## СПАРТАКІЯДА ВНУ БЕЛАРУСІ

# ТРЭЦІЯ — ГЭТА НЕ ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦІЯ

***Працягваецца Спартакіяда сярод ВНУ рэспублікі. Нядаўна паспяхова правялі чарговыя гульні валейбалісты (перамаглі каманду РТІ) і валейбалісткі (перамаглі Мінскі педістытут).***

Але галоўнай падзеяй мінулага месяца трэба назваць першынство ВНУ Беларусі па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях, якое прайшло ў Гомельскім лёгкаатлетычным манежы «Дынама».

Наша каманда не здолела сабраць мацнейшых. Так, майстар спорту міжнароднага класа па штурханню ядра Віктар Булат у гэты час выступаў пад сцягам зборнай Беларусі на чэмпіянаце свету ў Канадзе. На жаль, ніхто з нашых лёгкаатлетаў не паказаў высокіх вынікаў (не блытаць з месцам).

Тут трэба заўважыць, што ўсе спецыялісты адзначаюць, што узровень студэнцкай лёгкай атлетыкі з году ў год зніжаецца. У першую чаргу ў тэхнічных відах. Прычын называюць шмат: і разбурэнне ДЮСШ па лёгкай атлетыцы, і раскідванне студэнцкай лёгкай атлетыкі па розных таварыствах, Карацей, ёсць над чым падумаць, каб зрабіць адпаведныя выпраўленні.

А што тычыцца агульнакаманднага заліку, то першынствавала тут каманда Акадэміі фізвыхавання. Услед за ёй ідуць ГДУ і БДУ. Між тым, выступалі каманды дваццаці трох ВНУ рэспублікі.

## СПРЫНТ

# АПОШНІ СТАРТ — НА АЛІМПІЯДЗЕ

**Яшчэ адзін беларускі спартсмен упісаў буйнымі літарамі сваё імя ў сусветную гісторыю спорту. Канькабежац з Оршы Ігар Жалязоўскі стаў шасціразовым чэмпіёнам свету ў спрынтэрскім многаборстве.**

**Свой апошні тытул Ігар заваяваў на спаборніцтвах у Японіі. Дарэчы, раней ніводнаму канькабежцу свету за ўсю гісторыю не даводзілася паказаць такога выніку.**

**Акрамя перамогі ў Японіі, Жалязоўскі стаў пераможцам Кубка свету на дыстанцыі 1000 метраў і бронзавым прызёрам у агульным заліку. Як заявіў журналістам жалязоўскі, наступны сезон будзе апошнім у яго спартыўнай біяграфіі. І галоўная мэта ў ім — заваяваць алімпійскі медаль у Ліліхамеры.**

# РЭЙТЫНГ «АТЛЕТЫКА» РАСЦЕ

**На адкрытым першынстве СНД па кікбоксінгу Беларусь прадстаўляў мінскі прафесійны клуб «Атлетык», які мае высокі рэйтынг ва ўсім свеце. Не дзіва, што некаторыя сапернікі не дацягвалі нават да канца паядынку. Уладзімір Задыран накаўціраваў Ігара Шэфера, Андрэй Дудко — Аляксандра Сакалова. Атрымалі ўпэўненыя перамогі таксама Максім Палякоў, Алег Барызынец. Толькі адно паражэнне ў беларускіх кікбаксёраў — малады спартсмен Міхаіл Сцяпанаў ва ўпартым паядынку ўступіў вопытнаму валгаградцу Уладзіміру Паташкіну. Трэба заўважыць, што ў Маскве не выступалі дзве «зоркі» мінскага клуба — чэмпіён Еўропы Уладзімір Смірноў зараз хварэе, а наш накаўцёр Дзмітрый Сцяпанаў рыхтуецца да паядынку з трохразовым чэмпіёнам свету галандцам Янам Вэселсам.**

# УЧОРА «С», сёння «Б», заўтра «А»?

**Хакейная зборная Беларусі (юніёрская) на мінулым тыдні выступала ў Рызе на першынстве свету групы «С». Дзевяць каманд аспрэчвалі права ў наступным годзе гуляць рангам вышэй (група «В» сусветнай класіфікацыі).**

**Спачатку ў сваёй падгрупе беларусы абыгралі зборныя Эстоніі — 6:3 і Латвіі — 3:2. Трапіўшы ў фінальную тройку, Беларусь завершыла ўнічыю матч са Славеніяй — 3:3 і перамагла Славакію — 4:1. Набраўшы тры ачкі, нашы хакеісты сталі пераможцамі гэтага турніру. Што і казаць, малайцы! Тое, што не зрабілі ў Мінску нацыянальная і маладзёжная каманды, прайграўшы свае турніры, з поспехам ажыццявілі ў Латвіі нашы юніёры.**

## ПЕРШЫНСТВО БЕЛАРУСІ

# АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ

***Набліжаецца да фінішу жаночае першынство Беларусі па баскетболе. Камандам фінальнай групы засталося згуляць па некалькі матчаў, а потым ужо пройдуць суперфіналы за 1—2 і 3—4 месцы.***

Як адчуваюць сябе ў кагорце мацнейшых нашы дзяўчаты? Калі шчыра, дык не зусім утульна. Апошнім часам камандзе БДУ давялося змагацца з першым і другім саставам «Гарызонта». Дарэчы, замагаліся яны толькі з «Гарызонтам-2», прайграўшы першую гульню 62:65 і атрымаўшы перамогу ў другой — 66:45. «Гарызонт-І» без ніякіх намаганняў са свайго боку адолеў баскетбалістак БДУ — 122-52 і 90:46. Лічбы гавораць самі за сябе.

Пасля васьмі сустрэч каманда БДУ займае пятае месца (дзве перамогі). Ніжэй стаіць толькі другі састаў «Гарызонта» з адной перамогай (на жаль, над намі). У верхняй частцы табліцы стаяць: «Гарызонт-І» (8 перамог), Гродна (6), Гомель (4) і ЗКАФ (3).

Нашы дзяўчаты могуць падняцца вышэй і трапіць у суперфінал. Але для гэтага трэба перамагаць Акадэмію фізвыхавання. Задача не з лёгкіх, аднак і не з невырашальных.

## СПОРТ-ЭКСПРЭС

# ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

***Маскоўскі раённы спорткамітэт г. Мінска ў межах месячніка абаронна-масавай і спартыўнай работы, прысвечанай 48-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, правядзе спартакіяду ВНУ.***

Удзельнічаць будуць БДУ, МДМІ, МДПІ. У праграме спабооніцтваў стральба, валейбол (юнакі і дзяўчаты), баскетбол (юнакі і дзяўчаты) настольны тэніс, плаванне і шахматы.

Наша каманда плануе выступіць па поўнай праграме. Дарэчы, галоўны суддзя маючай адбыцца спартакіяды — загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ дацэнт С. У. Макарэвіч.

# ЖАНЧЫНЫ ТАКСАМА ЛЮБЯЦЬ МІНІ...

***Праз некалькі дзён у рэспубліцы пачнецца новы футбольны сезон. Для балельшчыкаў гэта вялікае свята. І да сваіх першых афіцыйных стартаў спартсмены рыхтаваліся старанна.***

Пра гэта сведчыць хаця б той факт, што да трэніровак каманды прыступілі толькі ў канцы снежня — пачатку студзеня. І, безумоўна, футбалісты (кі) не маглі абыйсціся без гульнявой практыкі. Многія каманды аддалі перавагу гульням пад дахам, у прыватнасці, міні-футболу.

Першым быў міжнародны турнір па міні-футболе, цудоўна арганізаваны вядомым у мінулым футбалістам Людасам Румбуцісам. Ён праходзіў у Палацы спорту 28—28 лютага. Міжнародным турнір быў не толькі на словах. Зборная Югаславіі, алімпійская зборная Літвы і Латвіі, «Дынама» (Якуцк) — гэтыя каманды сабраліся разам з алімпійскай зборнай Беларусі міні-футбольным клубам «Менск», камандамі «Фандак» (Бабруйск) і «Металург» (Маладзечна).

Тысячы балельшчыкаў, якія прыйшлі ў Палац спорту, былі задаволены ўсім (добрая арганізацыя, добры буфет, добрае футбольнае відовішча), акрамя канчатковага выніку. У фінале сустрэліся зборныя Югаславіі і Літвы. Больш маладыя літоўскія футбалісты аказаліся крыху мацнейшымі. А што тычыцца гаспадароў, то зборная Беларусі ў гульне за трэцяе месца адолела «Металург».

Праз некалькі дзён прайшоў традыцыйны міжнародны міні-футбольны турнір сярод жанчын. У госці да беларускіх каманд прыехала мацнейшая каманда з Украіны — «Легмаш» (Чарнаўцы). Фінальная гульня адбылася напярэдадні 8 сакавіка і сутрэліся ў ёй украінкі і Магілёўская «Надзея». Асноўны час завяршыўся ў нічыю (3:3). І толькі пенальці аддалі перавагу «Легмашу». Непрыемна, але што зробіш.

**Аляксандр ЮРЫН.**

# НЕ ЧАПЛЯЙЦЕСЯ, ХЛОПЦЫ, ДА ДЗЯЎЧАТ З МЕХМАТА

***Да кульмінацыі набліжаецца студэнцкая Спартакіяда БДУ 1992—1993 гг. У веснавым семестры ўжо прайшлі спаборніцтвы па некаторых відах спорту.***

ВАЛЕЙБОЛ (дзяўчаты). На старт выйшлі восем каманд. Найбольш паспяхова выступілі дзяўчаты ФПМ, якія і занялі першае месца. Другімі былі, і гэта поўная нечаканасць, студэнткі ФЭФ, трэцімі — спартсменкі геафака. Нечаканасцю турніра можна назваць адсутнасць каманды мехмата, якая на сённяшні дзень з'яўляецца галоўным прэтэндэнтам на чэмпіёнскае званне. За неяўку каманда не атрымала ачкоў у агульны залік, у той час, як іх галоўныя сапернікі — геафак і ФПМІ дадалі ў свой актыў адпаведна 40 і 30 ачкоў, чым скарацілі сваё адставанне ад лідэра.

ДЗЮДО. Сярод мужчын у спаборніцтвах удзельнічала сем каманд. Месцы ў першай пяцёрцы размеркаваны наступным чынам: юрфак, геафак, фізфак, гістфак і біяфак.

Упершыню праводзіўся турнір і сярод дзяўчат. Першыя старты паказалі — турнір мае будучыню і будзе папулярным. Як лічаць у спартклубе, на сённяшні дзень — гэта карысны для дзяўчат прыкладны від спорту. А што тычыцца вынікаў, то з шасці каманд-удзельніц месцы ў першай тройцы адпаведна занялі дзяўчаты з мехмата, ФПМІ і філфака.

НАСТОЛЬНЫ ТЭНС. Гэта можа падацца дзіўным, але ў спаборніцтвах прынялі ўдзел усе дванаццаць факультэцкіх каманд. Такое апошнім часам здараецца не часта. Упартая барацьба прынесла наступныя вынікі: мацнейшай аказзалася каманда ФПМІ. Юрыдычны, механіка-матэматычны і фізічны факультэты занялі адпаведна месцы з другога па чацвёртае.

***Праведзеныя старты не ўнеслі поўнай яснасці ў выніковую табліцу. Па-ранейшаму лідзіруе мехмат. На сённяшні дзень ён мае добры шанц на агульную перамогу і наўрад ці захоча з кім-небудзь падзяліцца. Аднак нельга забываць пра геафак і ФПМІ. Апошнія, дарэчы, зараз выступаюць паспяхова: два першых месцы, адно другое. Калі так і далей пойдзе, то не бяруся*** рабіць ***папярэднія прагнозы.***

***У самы бліжэйшы час (канец сакавіка-красавік) пройдуць спаборніцтвы па гіравым спорце, шахматах і плаванні. А ў маі — спартыўнае арыентаванне, футбол, крос і лёгкая атлетыка завершаць праграму чарговай Спартакіяды БДУ.***

**Аляксандр ЮРЫН.**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!




# ПЕРАМОГА БЕЛАРУСКІХ «МЯДЗВЕДЗЯЎ»

**Нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці, XXIV Міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прызы алімпійскага чэмпіёна А. Мядзведзя ўсё ж прайшоў у Мінску з поспехам. Асабліва для беларускай каманды, якая заваявала палову залатых медалёў.**

**С. ВАСІЛЬЕЎ.**

# ТАК ТРЫМАЦЬ!

Завершаны мінскі шахматны фестываль.

Гросмайстарскі турнір прынёс перамогу масквічу Яўгену Драгамарэцкаму — 7,5 з 11, а на ачко ад пераможцы адстала «сярэбраная пяцёрка», якую ўзначаліў па каэфіцыенту мінчанін Вячаслаў ДЫДЫШКА.

У майстарскім турніры 5-й катэгорыі да канца захаваў лідэрства Генадзь Тунік (Саратаў), які набраў у выніку 8 з 11. У шэвенінгенскім матчтурніцы абсалютнага выніка дабіўся студэнт БДУ Аляксандр Зажогін — 9 з 9!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

1 красавіка
Зак. 1700.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.

Газета падпісана ў друк 18.11.92 г. у 16.00.